ца ўлюбёным заняткам беларускай культуры. Пасьля Рыскага міру дзяржаўная *мяжа* прайшла па жывым целе народу.

Але беларусы, маючы дасюль столькі *межаў*, якія падзяляюць, у глыбіні душы працягваюць марыць пра іншую *мяжу* — тую, што злучае, зьбірае і яднае. Менавіта пра гэтую, сабраную *мяжой* прастору, калісьці сказаў Ян Чачот: „Маю кавалачак зямлі, на які магу паставіць лесьвіцу ў неба“.

# Мяжа

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Мяжа*. Гэтае гоцкае слова са значэньнем „той, што знаходзіцца пасярэдзіне“ ёсьць у той ці іншай форме ўва ўсіх славянскіх, а таксама балцкіх мовах. Ад пачатку 80-ых яно актыўна і пасьпяхова пачало выціскаць з нашай мовы запазычанае з расейскай *граніца*. *Граніца* здалася хутка, а вось *пагранічнікі* біліся да апошняга, пакуль урэшце ня выкінулі белы сьцяг перад *памежнікамі*. Цяпер пагранічнікі засталіся толькі ў некаторых афіцыйных пэрыёдыках ды ў лексыцы малаадукаваных людзей.

*Замежны*, *замежнік* — два гэтыя вытворныя словы для савецкага ў поглядах чалавека мусілі азначаць: непажаданы, непрымальны, чужы, варожы. Для нармальнага — прымальны, магчымы, свой, сяброўскі.

*Адмежавацца*, *разьмежавацца*. У нашым стагодзьдзі гэтыя вытворныя з шэрагаў гаспадарчых перайшлі ў шэрагі палітычныя. Цэлыя пакаленьні *абмежаваных* насельнікаў краю *адмяжоўваліся* ад выказваньняў сваіх нацыянальных лідэраў, ад творчасьці сваіх нацыянальных геніяў, ад сваёй гісторыі, культуры, мовы, традыцыяў, яны *разьмяжоўваліся* з братамі па пяры і ўяўнымі адшчапенцамі. Гэта пераходзіла *межы* ня толькі здаровага сэнсу, але й прыстойнасьці.

*Мяжа*, *межачка*, *узьмежак*, *межавы* й *памежны* слупы, *межавыя* знакі, а таксама *безьмеж*, *бязьмежжа*, *прамежкавы*, *прамежны* — словы й выразы аднаго гнязда.

Цягам XX стагодзьдзя *межы* Беларусі мяняліся некалькі разоў. Яны дзялілі краіну на Ўсходнюю і Заходнюю, яны забіралі зь ейнага складу абшары для суседзяў і потым часткова вярталі забранае. У выніку тэрытарыяльна абкрадзеная краіна знаходзіцца цяпер у *межах*, якія не адпавядаюць ані гістарычным, ані этнаграфічным, ані якім іншым *межам* беларускага народу. Затое цяпер Беларусь набыла *мяжу*, якой яна ня мела раней. За заходняй *мяжой* краіны пачынаецца цывілізаваны сьвет з усімі ненавіснымі ўладам дэмакратыямі, свабодамі і дабрабытамі. А ад сёньняшняга дня там яшчэ й пачынаюцца *межы* Паўночна-Атлянтычнае супольнасьці — NATO.

# Народ

***Сяргей Навумчык***

Найчасьцей слова „*народ*“ выкарыстоўваецца палітыкамі супрацьлеглых поглядаў, прычым кожны зь іх шчыра верыць у сваё права спасылацца на *народ* як на крыніцу ўласнае рацыі. У Менску выдаюцца „*Народная Газэта*“